# «ЗАМУЖ Я ВЫЙШЛА ТОЛЬКІ Ў 45 ГАДОЎ…»

## З успамінаў А.С. Сцепанюк, в. Бераставічаны

Анастасія Сцяпанаўна Сцепанюк ведае вайну не па карцінках і не з кніжак. Ёй было 17, калі немцы вывезлі ў Германію. З вёскі Бераставічаны, адкуль жанчына родам і дзе жыве цяпер, іх тады забралі 12 чалавек.

Як гэта адбывалася, як жыццё абыходзілася з ёю, Анастасія Сцяпанаўна раскажа сама.

- ***З чаго гэта «забіранне» пачыналася***?

- Прышлюць павестку. А ў ёй напісана: за няяўку на зборны пункт расстрэл усёй сям'і. Так што ніхто не рызыкаваў. Тым больш, што мы, бераставічанскія, ведалі, што расстрэл - не пустая пагроза. У вёсцы немцы расстралялі 9 чалавек: падпольшчыкаў з КПЗБ. Гэта было страшна. А яшчэ праз нейкі час хацелі спаліць усю вёску разам з жыхарамі. Мужчын сагналі ў адзін хлеў, жанчын - у другі. Выратаваў нас паліцэйскі. Ён быў пры Польшчы стражнікам пры пастарунку, потым паліцэйскім пры немцах. Відаць, годны быў чалавек, калі не пабаяўся пярэчыць немцам, як умеў даказваў, што гэта добрыя людзі, і яны ні ў чым не вінаватыя...

- ***З вашай сям'і павестка прыйшла толькі вам?***

- Так. У майго бацькі было шасцёра дзяцей, пяцёра - ад другой жонкі. Я самая старэйшая. Таму на мяне і ўпаў выбар.

Спачатку нас павезлі ў Гродна. Там усе прайшлі камісію: хворыя ды недалужныя немцам былі непатрэбныя. А здаровых пагрузілі ў вагоны для перавозкі цялят, пазабівалі вокны, каб свету не бачылі, і павезлі ва Усходнюю Прусію.

Прывезлі нас у Інстэрбрук, цяпер горад Чарняхоўск. Паставілі строем перад размеркавальнай камісіяй. Немец падыдзе, палкай гумавай паверне цябе, каб з усіх бакоў тавар паказаць…

- ***І хутка вас разабралі?***

- Хутка, праўда тых, хто быў здаровы і дужы. Бралі ж для цяжкай працы, не для чаго іншага. А я - малалетка, і ростам яшчэ не выйшла. Мяне ўзялі, калі ўжо выбару больш не засталося.

- ***І куды вы трапілі?***

- У звычайную нямецкую вёску. Мне пашанцавала, трапіла я да харошых людзей. Бог мяне, малую, бярог. Гаспадыні, фраў Эльтбеце, было 70 гадоў. Адзін сын яе загінуў, дочка сядзела ў турме за спробу выратаваць палоннага. А меншы сын, ён і прывёз мяне , быў прыкладна маім равеснікам.

- ***Якія былі да вас адносіны?***

- У адрозненне ад іншых месцаў – людскія. Ела я разам з гаспадарамі. І работай не задушвалі, бо гаспадарка была малая. Можа ўсё і нічога было, але ж гняла няволя, так хацелася дадому...

***- А як прыйшло вызваленне?***

- Як пачаў набліжацца фронт, гаспадароў эвакуіравалі на захад. Потым і нам прыйшоў загад ехаць туды на падводах. Нам - гэта мне і яшчэ аднаму парабку, які быў родам з Украіны. Калі мы выехалі, падводаў на дарозе было ўжо многа, утвараліся пробкі. Мы адсталі, на ноч спыніліся ў дамку каля лесу. Гаспадары выехалі і нічога з сабою не забралі. Скаціна ў хляве стаяла.

Акрамя нас, былі там і яшчэ такія самыя ўцекачы. Пераначавалі мы там тры ночы, а раніцай чуем: па-руску гавораць. Гэта былі разведчыкі. Адзін з іх урэзаўся мне ў памяць. Убачыўшы хлопчыка, што быў у дамку разам з маці, ён з камяком у горле, паказваючы на малога, сказаў: «На майго такога немцы кулі пашкадавалі, аб слуп тэлеграфны...»

Байцы прыспешвалі нас: «Бярыце ўсё, што хочаце і з'яжджайце хутчэй на ўсход пакуль бой распачнецца».

***- Паспелі ўцячы?***

- Толькі выехалі з лесу - стральба. На першай падводзе забіла хлопца. А потым пачалі свістаць снарады. Мяне кантузіла і зусім засыпала зямлёю. Мяне не кінулі, то неслі, то вялі пад рукі. Неяк дацягнуліся да зборнага пункта. Фронт як ішоў, так і пайшоў. А мы ў гарадку толькі што вызваленым спыніліся. Я яшчэ як след не ачомалася, а тут прыехаў вайсковец набіраць санітарак у шпіталь. Пра мяне гаворка не ішла. Прапанаваў ён жанчыне, са Смаленска яна была. Тая кажа: «Мне ўсё роўна ехаць няма куды, але гэту дзяўчынку (мяне, значыць) я не кіну». Так я і апынулася ў шпіталі.

***- Узялі санітаркай?***

- Напачатку лячылі, працаваць не давалі. Але нядоўга гэта было. Шпіталь быў сартавальны. Лёгка параненых пакідалі, цяжкіх адпраўлялі далей. Работы было - па трое сутак не спалі.

Калі вайна закончылася, увесь наш шпіталь на японскі фронт накіравалі. Ехалі цэлы месяц.

***- І паспелі?***

- Не. У Хабараўскі край заехалі, у горад ці пасёлак Кульдур. Там воды ўсялякія. Курорт. Там мы і пачулі, што амерыканцы скінулі на Японію атамныя бомбы, і што вайне канец. Я магла тады застацца ў Сібіры. Бралі на курсы медсясцёр. Але сястра напісала, што моцна хворы бацька.Ды і так вельмі ж хацелася да дому...

***- А як ваш лёс склаўся пасля вайны?***

- Цяжкай работы ў жыцці было па вушы. Спачатку на сваёй зямлі, потым у калгасе... Замуж я маладая не выйшла, не хацела, а дзяцей двое маю. Помню, нарадзіла дочку, а ўсе дапытваюцца ад каго. А я і хлопцу свайму не сказала, што цяжарная. Нейк раз прыйшла яго маці: «То ўжо можа скажаш ад каго?». А я адказваю: паглядзі на сваю ўнучку.

***- І што замуж так і не выйшлі?***

- Выйшла ў 45 гадоў, калі ўжо ўнукаў мела. Дзеля мяне Сцяпан Ціханавіч пакінуў сваю сям'ю. Жонка за ім не прападала. А яго дзеці і цяпер да мяне ездзяць.

Масцеравы быў чалавек, шмат чаго зрабіў добрага людзям. І дома сапраўдны гаспадар. І ўнучку маю гадаваў. Я на рабоце, а ён з малою.

***- А чаму вам прыйшлося гадаваць унучку?***

- Мая нявестка пры родах памерла. Ніначку я ўзяла з радзільнага дома. А цяпер яе дзяцей, маіх праўнукаў, дапамагаю гадаваць.

У заключэнне размовы хачу сказаць, што Анастасія Сцяпанаўна варты ў Бога чалавек. У яе юбілей,за плячыма 80 жыццёвых паверхаў, юнацтва, якога не было, жахі вайны… А яна зусім не выглядае па-старэчы. Не проста ходзіць, а бягом яшчэ бегае. З найменшым Ілюшай да дачкі ў Маскоўскую вобласць ездзіла. Там усе дзівіліся як добра маці-бабуля-прабабуля выглядае.

Інтэрв'ю ўзяла Ніна Абрамовіч, в. Бераставічаны, 2005 год.